Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

АКЦЫЯ «НАШЫ ДЗЕЦІ» СТАРТУЕ Ў ВІЦЕБСКУ 5



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

13 СНЕЖНЯ 2024 г. ПЯТНІЦА № 243 (30377)

# «САМАЗАСПАКОЙВАЦЦА НАМ НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕЛЬГА»

## Каб сапернікі і праціўнікі разумелі, што з беларусамі лепш не звязвацца

**Прэзідэнт зацвердзіў Задуму абароны Беларусі на бліжэйшую пяцігодку.**

СТАР. 2



Фота БелТА.

## Цяпер, каб аформіць дачу, не трэба ехаць туды, дзе яна знаходзіцца

Актуальна



**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Закон «Аб змяненні законаў па пытаннях дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй», што забяспечвае комплекснае і сістэмнае ўдасканаленне адносін у гэтай сферы.**

Першае, на што звярнула ўвагу **начальнік упраўлення рэгістрацыі і тэхнічнай інвентарызацыі нерухомай маёмасці Дзяржкаммаёмасці Святлана ЮРКАВЕЦ**: указам уводзіцца экстэрытарыяльны прынцып рэгістрацыйных дзеянняў. Цяпер звярнуцца па паслугу афармлення нерухомасці можна будзе ў любое агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі незалежна ад месца знаходжання маёмасці. Па меркаванні Святланы Юркавец, гэта спросціць ажыццяўленне адміністрацыйных працэдур і скароціць часовыя і фінансавыя выдаткі простых людзей і прадстаўнікоў бізнесу.

Адным са змяненняў стала атрыманне магчымасці засведчання дагавора з нерухомасцю адначасова двума або больш рэгістратарамі ў некалькіх офісах агенцтваў па дзяржаўнай рэгістрацыі, у якіх у адзін час прысутнічаюць бакі дагавора. Дагэтуль засведчанне дагавора ажыццяўлялася хоць і без прывязкі да месца знаходжання аб'екта нерухомасці, але адным рэгістратарам у адным месцы з адначасовым удзелам усіх бакоў дагавора.

Акрамя таго, дакументам устанаўліваецца аўтаматычнае ўнясенне ў рэгістр нерухомасці выпраўленняў, звязаных са змяненнем персанальных даных або найменняў юрыдычных асоб — праваўладальнікаў нерухомай маёмасці.

Сёння такія выпраўленні ўносяцца ўручную рэгістратарам па заяве зацікаўленай асобы за плату. Гэта таксама паскорыць сістэму рэгістрацыі і зробіць яе таннейшай.

Акрамя гэтага, уводзіцца абавязковае дасудовае абскарджанне дзеянняў (бяздзейнасці) рэгістратара толькі ў Нацыянальнае кадастравае агенцтва, выключаючы зварот у мясцовае агенцтва па дзяржрэгістрацыі. І толькі пасля гэтага — у суд.

СТАР. 5

# Месца рэгістрацыі змяніць можна

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Ідзе падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2025 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2025 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# «САМАЗАСПАКОЙВАЦЦА НАМ НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕЛЬГА»

**Важнае мерапрыемства ў графіку Прэзідэнта — пасяджэнне Савета Бяспекі. На парадку дня — пытанні планавання абароны нашай дзяржавы на сярэднетэрміновую перспектыву.**

«Апошнія гады ваенна-палітычная абстаноўка вакол краіны змянілася, і, на жаль, не ў лепшы бок, як усе мы разумеем і канстатуем, перш за ўсё ваенныя спецыялісты. Не сакрэт, што галоўнай тэндэнцыяй гэтага моманту з'яўляецца назапашванне канфліктнага патэнцыялу ў розных рэгіёнах свету. Асобныя дзяржавы, імкнучыся паказаць сваю значнасць і прэтэндуючы на ролю рэгіянальных лідараў, працягваюць нагнятаць абстаноўку вакол нашай краіны», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, дзеянні НАТА і асабліва падзеі на паўднёвым флангу, Украіна і дэструктыўная рыторыка еўрапейскіх краін у дачыненні да Беларусі — усё гэта сведчыць аб бесперапынных спробах расхістаць унутрыпалітычную сітуацыю ў нашай краіне.

«Яшчэ раз хачу падкрэсліць: нам самазаспакойвацца ні ў якім разе нельга», — папярэдзіў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў: той факт, што ў краіне спакойна, што многія людзі перагледзелі свае меркаванні, не дае падстаў, каб расслабляцца.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**«Не трэба думаць, што мы разумныя і бога за бараду ўзялі, а ўсе вакол нас — у НАТА, у Амерыцы — дурні. Не, гэта вопытныя людзі, з вялізнай сілішчай, таму нам расслабляцца нельга. Мы павінны працаваць са сваім народам, пераконваць, паказваць, а галоўнае — працаваць так, каб людзям было лепш. Тады яны будуць такую ўладу падтрымліваць. Таму будзем у гэтым кірунку працаваць, будзем прымаць і папераджальныя дзеянні, пэўныя дзеянні, каб нашы верагодныя сапернікі і праціўнікі разумелі, што з намі лепш не звязвацца, што з намі трэба жыць дружна. Мы на гэта нацэльваем усю палітыку нашай дзяржавы», — падкрэсліў беларускі лідар.**

Асобна Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што беларуская армія нікому не пагражае, а з'яўляецца інструментам недапушчэння вайны. «А ў выпадку агрэсіі павінна быць здольная яе адбіць. У гэтым і заключаецца асноўнае прызначэнне ваеннай арганізацыі дзяржавы», — канстатаваў Прэзідэнт.

**Валерыя СЦЯЦКО.**



Фота БелТА.

● **На слыху**

## Якое дадатковае даручэнне наконт «Арэшніка» даў Прэзідэнт? Удакладнілі ў Генштабе

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў забяспечыць размяшчэнне на тэрыторыі краіны расійскага ракетнага комплексу «Арэшнік» і правільна спланаваць яго прымяненне. Аб гэтым, адказваючы на пытанні журналістаў, паведаміў начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Беларусі Павел Муравейка па выніках пасяджэння Савета Бяспекі.

Журналісты ўдакладнілі, ці абмяркоўвалася ў ходзе пасяджэння тэма пастаўкі ў Беларусь сучаснага расійскага комплексу «Арэшнік» і ці былі нейкія дадатковыя даручэнні кіраўніка дзяржавы наконт гэтага.

«Даручэнне адно — забяспечыць размяшчэнне на нашай тэрыторыі «Арэшніка» і правільна спланаваць яго прымяненне», — сказаў Павел Муравейка.

На ўдакладняльнае пытанне, колькі менавіта такіх комплексаў плануецца паставіць у Беларусі, начальнік Генштаба адказаў: «Пра гэта ведае толькі Прэзідэнт Расіі».

Характарызуючы ў цэлым абстаноўку, якая складваецца вакол Беларусі, Павел Муравейка падкрэсліў, што назваць яе спакойнай нельга. Гэтаму садзейнічае і мілітарызацыя суседніх краін, якая прадаўжаецца, і падзеі, што адбываюцца ва Украіне, і інфармацыйная кампанія, разгорнутая ў адносінах да Беларусі з мэтай дыскрэдытаваць органы ўлады і кіраўніцтва краіны, каб забяспечыць умовы для ўзнікнення або правакавання розных канфліктаў.

Як паведамлялася, прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін на пасяджэнні Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы 6 снежня ў Мінску дамовіліся, што Расія паставіць у Беларусь сучасны ракетны комплекс «Арэшнік». З адпаведнай просьбай да кіраўніка расійскай дзяржавы звярнуўся беларускі лідар, і Прэзідэнт Расіі адказаў станоўча. «Я хачу публічна папрасіць вас, каб новыя сістэмы ўзбраення, і перш за ўсё «Арэшнік», былі размешчаны на тэрыторыі Беларусі. Гэта сур'ёзна супакоіла б некаторых, якія ўжо гатовы ваяваць супраць Беларусі», — сказаў тады Аляксандр Лукашэнка.

«У нас ёсць вызначаныя месцы, дзе мы можам размясціць гэту зброю. З адной толькі ўмовай — што цэлі для гэтай зброі будуць вызначацца ваенна-палітычным кіраўніцтвам Беларусі. А пакуль вы нас абучыце карыстацца гэтай зброяй, калі гэта будзе зроблена (будзе прынята станоўчае рашэнне па размяшчэнні ў Беларусі. — **Заўв. БелТА**), каб спецыялісты Расійскай Федэрацыі абслугоўвалі і ажыццяўлялі пускі па вызначаных цэлях баявымі зарадамі «Арэшніка». Вы гэта ўмееце рабіць, вы гэта прадэманстравалі нядаўна», — падкрэсліў беларускі лідар.

● **У тэму**

## «Наша мэта — стварыць умовы недапушчэння ваеннай агрэсіі»

Журналістам **міністр абароны Віктар ХРЭНІН** расказаў, што падчас пасяджэння Савета Бяспекі кіраўніку дзяржавы прадставілі Задуму абароны нашай краіны, якая стане асновай рашэння на абарону і дасць магчымасць Генеральнаму штабу і ўсім дзяржаўным органам кіравання пачаць планаванне абароны нашай дзяржавы ў выпадку ўзнікнення агрэсіі.

«Прадстаўленая Задума была распрацавана на аснове глыбокага аналізу і падзей па выніках «каляровай рэвалюцыі» 2020 года, аналізу спецыяльнай ваеннай аперацыі і зменненяў, зацверджаных Усебеларускім народным сходам у Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі і Ваеннай дактрыне», — адзначыў міністр.

У распрацоўцы Задумы ўдзельнічалі ўсе дзяржаўныя органы, якія адказваюць за пытанні нацыянальнай бяспекі. «У далейшым нам трэба будзе больш дэталёва заняцца планаваннем, вызначыць ролю і месца кожнага дзяржаўнага органа і кожнага грамадзяніна ў забеспячэнні бяспекі нашай краіны, зыходзячы з прынцыпаў неабходнай дастатковасці і эканамічных магчымасцяў дзяржавы, — сказаў Віктар Хрэнін. — Хачу асабліва падкрэсліць, што гэта планавая работа, гэта не надзвычайшчына. Такая работа перыядычна праводзіцца. Мы зыходзім з таго, што ніякіх агрэсіўных планаў у адносінах да іншых дзяржаў у нас няма. Наша мэта — стварыць умовы недапушчэння ваеннай агрэсіі і ўцягвання нашай краіны ў вайну. А ў выпадку, калі гэта адбудзецца, даць надзейны адпор».

## «Падрыхтоўка дзяржавы да абароны ахоплівае ўсе сферы»

Як заўважыў **начальнік Генеральнага штаба Павел МУРАВЕЙКА,** Задума абароны дзяржавы — падмурак стратэгічнага планавання абароны. Ён раскрыў некаторыя аспекты гэтага дакумента: «У ім канкрэтна прадстаўлены пяць асноўных стратэгічных напрамкаў. Зніжэнне ўзроўню ваеннай небяспекі і прадухіленне ваенных канфліктаў — гэта значыць дзеянні, якія будуць прымяняцца намі ў палітычнай, эканамічнай, інфармацыйнай і ваеннай сферах для таго, каб гэта забяспечыць. Гэта падрыхтоўка дзяржавы да абароны, якая ахоплівае ўсе сферы: ад эканомікі да вайсковай сферы. Гэта варыянты ўзброенай абароны нашай краіны пры розных канфліктах. Акрамя таго, гэта пытанні падрыхтоўкі эканомікі і функцыянавання дзяржавы ў цэлым ва ўмовах вядзення ваенных дзеянняў. Немалаважная ўвага аддадзена такому аспекту, як падтрыманне міжнароднага міру і бяспекі і ліквідацыя розных праяў, якія могуць паўплываць на бяспеку».

Па словах начальніка Генеральнага штаба, Задума распрацавана на 2026—2030 гады, на найбліжэйшую пяцігодку.

## «Мы назіраем за тым, што адбываецца ў свеце»

**Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ** адзначыў, што ў Задуме абароны дзяржавы ўлічаны выклікі і пагрозы не толькі побач з Беларуссю. «Мы назіраем за тым, што сёння адбываецца ў свеце: Сірыі, Грузіі, Малдове ды іншых дзяржавах. Усё гэта ўплывае на бяспеку і абарону інтарэсаў той ці іншай дзяржавы», — сказаў ён. Аляксандр Вальфовіч падкрэсліў, што ў гэтым годзе завяршаецца дзеючы план абароны дзяржавы, у якім не закладзены былі пагрозы, што сыходзяць з паўднёвых рубяжоў. Па яго словах, у абноўленым плане гэтыя рэаліі ўлічаны.

Дзяржсакратар расказаў, што ў адпаведнасці з Задумай абароны дзяржавы на працягу года дзяржаўнымі органамі пад кіраўніцтвам Генеральнага штаба будуць праведзены дэталёвыя разлікі і падрыхтаваны дакументы плана абароны дзяржавы. Структура плана абароны таксама зацверджана Прэзідэнтам. У лістападзе — снежні наступнага года будзе поўнасцю складзены план абароны дзяржавы і вынесены на зацвярджэнне Савета Бяспекі.

Журналісты пацікавіліся, ці абмяркоўвалася гарантаванне бяспекі падчас прэзідэнцкіх выбараў. «Выбары — гэта толькі адрэзак у жыцці дзяржавы. Таму гарантаванне бяспекі, калі гаворым пра выбары, нейкае іншае палітычнае ці святочнае мерапрыемства, — пастаянная задача структур, якія за гэта адказваюць, — адзначыў Аляксандр Вальфовіч. — Самая галоўная задача, каб наш народ адчуваў сябе спакойна заўсёды: і падчас выбараў, і ў іншыя дні».

## «Вы можаце быць абсалютна ўпэўнены, што тут у вас надзейныя сябры»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са старшынёй Следчага камітэта Расійскай Федэрацыі Аляксандрам Бастрыкіным. Сустрэча пачалася з прыемнага абавязку. Аляксандр Бастрыкін уручыў беларускаму лідару медаль Следчага камітэта Расіі — «За вернасць службоваму абавязку». «У гонар вашага юбілею і за тое, што вы ўмацоўваеце наша супрацоўніцтва — следчых камітэтаў Беларусі і Расіі — і ўносіце ў гэта ў тым ліку свой неацэнны ўклад», — сказаў старшыня расійскага СК.**

«Грэх быў бы, калі б мы не сустрэліся, калі вы ў Беларусі знаходзіцеся. Маё стаўленне да вас вы ведаеце. Нашы погляды абсалютна ідэнтычныя, разыходжанняў практычна няма», — адзначыў Прэзідэнт.

Гаворачы пра адносіны следчых ведамстваў дзвюх краін, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Вы заўсёды адгукаецеся на мае просьбы, у тым ліку, можа быць, на тыя, што і не датычацца Следчага камітэта Расіі. Я вам за гэта вельмі ўдзячны». Кіраўнік дзяржавы запэўніў, што беларусы ў любы момант гатовы адказаць такім жа чынам. Ён падкрэсліў, што Следчы камітэт Расіі можа разлічваць на беларускіх партнёраў у самых розных кірунках: падрыхтоўка спецыялістаў, абмен вопытам, падтрымка на міжнароднай арэне ініцыятыў, у сумеснай дзейнасці. «Мы будзем дзейнічаць разам, што б тут ні казалі, як бы нас ні спрабавалі расцягнуць у розныя бакі, хаця гэта менш датычыцца кіраўнікоў следчага камітэта — аднаго і другога — і ўвогуле ведамстваў. Гэта больш датычыцца палітыкаў, але, тым не менш, па-за палітыкай сёння нічога няма, у тым ліку і вашы ведамствы гэтак жа не могуць быць па-за палітыкай... Вы можаце быць абсалютна ўпэўнены, што тут у вас надзейныя сябры», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Бастрыкін расказаў, што прыбыў у Мінск, каб падвесці вынікі работы на сумеснай калегіі Следчага камітэта Беларусі і Расіі. Мерапрыемства штогадовае. «Актыўнасць наша толькі нарастае, у добрым сэнсе гэтага слова. Мы ўзаемадзейнічаем па розных кірунках. Я дзякую вам за аператыўную рэакцыю на нашы просьбы», — сказаў ён.

● У тэму

### Галоўнае — абмен вопытам

Журналістам Аляксандр Бастрыкін расказаў, што абмяркоўваў з Прэзідэнтам Беларусі. Галоўная тэма — абмен вопытам у тых кірунках, па якіх працуе Следчы камітэт Расіі. «Першы кірунак — гэта спецыяльная ваенная аперацыя. Мы вядзём расследаванні злачынстваў кіеўскага рэжыму. Яны здзяйсняюць цяжкія злачынствы супраць мірнага насельніцтва. На жаль, і нашы следчыя гінуць. Але мы працягваем настойліва працаваць, і я аб гэтым расказаў. І другая праблема — гэта міграцыйная злачыннасць. На жаль, у Расіі ў сувязі з заездам мігрантаў гэта праблема становіцца ўсё большай. Цяпер Дзяржаўная Дума Расіі прымае шмат рашэнняў па гэтым пытанні. Я расказаў Аляксандру Рыгоравічу аб нашым досведзе, ён мяне ўважліва выслухаў. Спадзяюся, кіраўніцтву Беларусі спатрэбіцца гэты вопыт з пункту гледжання прафілактыкі росту міграцыйнай злачыннасці ў Беларусі», — расказаў Аляксандр Бастрыкін.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Парламенцкі дзённік

# ДАБРАБЫТ ГРАМАДЗЯН І ПАДТРЫМКА РЭАЛЬНАГА СЕКТАРА ЭКАНОМІКІ

## Сенатары прынялі галоўныя фінансавыя дакументы на будучы год

**Традыцыйна напрыканцы года ўвага парламентарыяў скіравана на асноўныя фінансавыя дакументы краіны. Сярод іх — законапраект «Аб змяненні законаў», які найперш прадугледжвае карэкціроўку Падатковага кодэкса, і праект Закона «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2025 год».**



### ПАВЕЛІЧЭННЕ ЗАРОБКАЎ І ПАДТРЫМКА ТЫХ, ХТО БУДУЕЦЦА

У будучым годзе даходы рэспубліканскага бюджэту плануюцца ў памеры 45 835,8 млн рублёў, што на 8,1 % больш, чым ацэнка паступленняў мінулага года. Расходы рэспубліканскага бюджэту ў будучым годзе плануюцца ў суме 50 295,2 млн рублёў (з ростам на 12 % да ацэнкі 2024 года).

**Старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Савета Рэспублікі Уладзіслаў ТАТАРЫНОВІЧ** адзначыў, што бюджэт краіны на будучы год сфарміраваны згодна з традыцыйнымі падыходамі. «Ён улічвае асноўныя паказчыкі прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2025 год, бюджэт збалансаваны згодна з паказчыкамі грашова-крэдытнай палітыкі, улічвае ўсе мэтавыя задачы, у тым ліку задачы, пастаўленыя кіраўніком дзяржавы і ўрадам Нацыянальнаму банку па абмежаванні ўзроўню інфляцыі ў памеры не больш за 5 %», — канкрэтызаваў сенатар.

Традыцыйна рэспубліканскі бюджэт захоўвае сацыяльную накіраванасць. «42 % (у абсалютнай суме гэта каля 36 мільярдаў беларускіх рублёў) — расходы сацыяльнага характару: на ахову здароўя, адукацыю, культуру, сацыяльную абарону, — канкрэтызаваў Уладзіслаў Татарыновіч. — Больш чым на 10 % у рамках праекта бюджэту павялічваюцца расходы на заработную плату, выплату пэўных надбавак у бюджэтнай сферы. У такой жа прапорцыі павялічваюцца расходы на выплату сямейнага капіталу. Вялікія расходы ў нас будуць накіраваны на падтрымку грамадзян пры жыллёвым будаўніцтве, у тым ліку будзе працягнута практыка арэнднага будаўніцтва арэнднага і сацыяльнага жылля для найбольш запатрабаваных катэгорый».

По словах парламентарыя, фінансавыя рэсурсы будуць залежаць не толькі ад рэалізацыі мер падатковага характару, але і ад рэальных вынікаў работы эканомікі ў будучым годзе. Ён расказаў, што вялікая ўвага, згодна з праектам бюджэту, будзе ўдзелена і падтрымцы нацыянальнай эканомікі, айчынных прадпрыемстваў і арганізацый, якія вымушаны працаваць у асаблівых умовах.

Як акцэнтавала ўвагу **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА,** рэспубліканскі бюджэт сфарміраваны збалансавана. «Радуе тое, што па ўсіх кірунках: і ахова здароўя, і адукацыя, і сацыяльная абарона — усюды ёсць рост, прычым сур'ёзны», — удакладніла спікер.

### ЗМЯНШЭННЕ ПАДАТКОВАЙ НАГРУЗКІ І НОВЫЯ ПАЎНАМОЦТВЫ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ

Карэкціроўка Падатковага кодэкса, у прыватнасці, прадугледжвае індэксацыю падатковых ставак, устаноўленых у абсалютных велічынях, на прагнозны індэкс росту спажывецкіх цэн. Павялічваюцца стаўкі акцызаў на тытунёвыя вырабы і алкагольную прадукцыю з улікам міжнародных абавязацельстваў. Адмяняюцца асобныя малаэфектыўныя падатковыя льготы. Для шматдзетных сем'яў здымаецца абмежаванне ў выглядзе адной кватэры пры прымяненні маёмаснага падатковага выліку. На 20 % зніжаюцца ўстаноўленыя стаўкі па адзіным падатку для індывідуальных прадпрымальнікаў — бацькоў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, старэйшых за 18 гадоў, якія маюць I або II групу інваліднасці.

З 1 студзеня 2025 года мясцовыя Саветы дэпутатаў будуць валодаць правам вызваляць плацельшчыкаў ад прымянення павышальнага каэфіцыента 3 да стаўкі зямельнага падатку. Да 1 студзеня 2028 года працягваецца дзеянне стаўкі падаходнага падатку ў памеры 13 % адносна даходаў фізічных асоб, атрыманых па працоўных дагаворах ад рэзідэнтаў Парка высокіх тэхналогій.

Замацоўваецца стаўка падатку на прыбытак у памеры 30 % для аператараў сотавай рухомай электрасувязі і камерцыйных мікрафінансавых арганізацый. Абласныя Саветы дэпутатаў надзяляюцца правам на пастаяннай аснове ўводзіць мясцовы збор за перасячэнне транспартнымі сродкамі Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь. Пашыраюцца магчымасці прымянення стандартнага падатковага выліку, устаноўленага для маладых спецыялістаў за кошт выпускнікоў устаноў адукацыі Белкаапсаюза, маладых спецыялістаў, накіраваных на работу ў адвакацкія і натарыяльныя канторы, маладых спецыялістаў, накіраваных на навучанне ў замежныя арганізацыі на ўмовах дагавора, заключанага адпаведным дзяржаўным органам.

«Прапановы, якія ўключаны ў праект закона, носяць планавы характар, — рэзюмаваў Уладзіслаў Татарыновіч. — У цэлым усе меры, накіраваныя на карэкціроўку Падатковага кодэкса, для асноўнай масы плацельшчыкаў не прывядуць да павелічэння падатковай нагрузкі. Наадварот, па ацэнцы спецыялістаў Міністэрства фінансаў, узровень падатковай нагрузкі ў параўнанні з бягучым годам знізіцца дзесьці на 0,5-0,6 пра-цэнтнага пункта і складзе прыблізна 24,5-24,6 %».

Акрамя таго, члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу адобрылі законапраект «Аб забеспячэнні адзінства вымярэнняў», які зніме некаторыя супярэчнасці і ліквідуе шэраг заканадаўчых прабелаў, і ратыфікавалі шэраг міжнародных дакументаў.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**



Сенатары разгледзелі праект пастановы Савета Рэспублікі «Аб Заяве Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь аб неабходнасці спынення эканамічнай, гандлёвай і фінансавай блакады, уведзенай Злучанымі Штатамі Амерыкі супраць Рэспублікі Куба».

Наталля Качанава звярнула ўвагу, што Беларусь і Кубу яшчэ з часоў Савецкага Саюза звязваюць добрыя сяброўскія адносіны. «Іх дэлегацыя была ў нас, яны чакаюць нас з візітам на Кубу, — удакладніла яна, кажучы аб міжпарламенцкім узаемадзеянні. — Гэта мужны народ, які многія гады ва ўмовах санкцый не паддаецца ні на якія прапановы ўзамен на зняцце санкцый адмовіцца ад сваёй незалежнасці. Яны робяць усё для таго, каб захаваць суверэнітэт сваёй краіны».

Як патлумачыў у размове з журналістамі **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Дзмітрый ЖУК,** сэнс заявы зразумелы і відавочны — гэта адмена санкцыйнай палітыкі. «Мы не па чутках ведаем, што такое санкцыі, і таму лічым, што двайныя стандарты, двайная мараль не прымальныя ў развіцці сучаснага свету, — падкрэсліў ён. — На жаль, тыя санкцыі, гандлёвыя і эканамічныя, якія Злучаныя Штаты ўвялі супраць Кубы, значна стрымліваюць магчымасці развіцця і, галоўнае, павышэння ўзроўню жыцця простых грамадзян Кубы».

Сенатар заявіў, што члены Савета Рэспублікі вітаюць рэзалюцыю Генеральнай Асамблеі ААН аб неабходнасці спынення блакады, уведзенай ЗША супраць Кубы, прынятую 30 кастрычніка. «Са 193 краін «за» прагаласавала 187, «супраць» — 2 (ЗША і Ізраіль), устрымалася Малдова, — праінфармаваў Дзмітрый Жук. — Мы бачым, што гэта рашэнне — трэнд на сыход ад двайных стандартаў і аднабаковых эканамічных санкцый — папулярнае і падтрымана сусветнай супольнасцю».

Інтэграцыя

# БЮДЖЭТ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ ПРЫНЯТЫ

## Ён складзе амаль 7,5 мільярда расійскіх рублёў




**Учора ў Маскве прайшло пасяджэнне шэсцьдзясят сёмай сесіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. Падчас сесіі парламентарыі разгледзелі праект бюджэту Саюзнай дзяржавы на 2025 год.**

Беларускую дэлегацыю, у склад якой увайшлі парламентарыі абедзвюх палат парламента, узначальваў **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА.**

У сваім выступленні на сесіі спікер Палаты прадстаўнікоў адзначыў: «Пасяджэнне Вышэйшага дзяржаўнага савета, якое адбылося днямі ў Мінску, падпісаныя кіраўнікамі дзяржаў дакументы сталі чарговым крокам па ўмацаванні саюзніцкіх адносін, стварэнні надзейных міжнародна-прававых гарантый рэалізацыі народамі Беларусі і Расіі суверэннага права на ўласны шлях развіцця. Нягледзячы на каласальны знешні ціск, Саюзная дзяржава дэманструе ўсяму свету сваю магутную сілу, канкурэнтаздольнасць і служыць прыкладам супрацоўніцтва, пабудаванага на прынцыпах даверу і дружбы народаў».

Як заўважыў Ігар Сергяенка, узаемадзеянне дзвюх краін ахоплівае практычна ўсе сферы жыццядзейнасці: засваенне космасу, развіццё прамысловасці, мікраэлектронікі, сельскай гаспадаркі, забеспячэнне абароны і бяспекі, роўнасць правоў грамадзян, паглыбленне гуманітарных сувязяў. Гаворачы аб бюджэце Саюзнай дзяржавы, кіраўнік беларускай дэлегацыі прывёў красамоўную лічбу: бюджэт, які пачынаўся з 500 мільёнаў расійскіх рублёў, за 25 гадоў дасягнуў амаль 7,5 мільярда.

Павялічваецца і колькасць праграм і праектаў, якія фінансуюцца. Сёння ў скарбонцы Саюзнай дзяржавы больш за 90 праграм на суму 60 мільярдаў расійскіх рублёў. «Гэтаму спрыяе паслядоўная рэалізацыя стратэгічных прыярытэтаў, выпрацаваных кіраўнікамі нашых дзяржаў, а таксама інтэнсіўныя міжурадавыя сувязі і цесныя кантакты на ўзроўні рэгіёнаў», — падкрэсліў Ігар Сергяенка, дадаўшы, што свой унёсак у працэс саюзнай інтэграцыі робіць і парламентарыі. Практычна па ўсіх ключавых кірунках створаны камісіі Парламенцкага сходу, якія вядуць глыбокі аналіз дасягнутых вынікаў, існуючых праблемных пытанняў і, галоўнае, сумесна з профільнымі міністэрствамі і Пастаянным камітэтам Саюзнай дзяржавы шукаюць і выпрацоўваюць шляхі іх вырашэння.

«Мы павінны і ў далейшым прадпрымаць канкрэтныя крокі па развіцці шматпланавага супрацоўніцтва, працягнуць практыку правядзення «ўрадавай гадзіны», ажыццяўляць парламенцкі кантроль за забеспячэннем роўных правоў грамадзян Беларусі і Расіі, суб'ектаў гаспадарання, фарміраваннем адзінага рынку энергарэсурсаў, мадэрнізацыяй прамысловасці, стварэннем новых тэхналогій і ліквідацыяй пакінутых перашкод у двухбаковым гандлі,» — абазначыў задачы на будучыню спікер Палаты прадстаўнікоў.

**По выніках сесіі праект бюджэту Саюзнай дзяржавы быў прыняты. Ён сфарміраваны па даходах у суме 7 328,1 мільёна расійскіх рублёў, па расходах — у суме 6 942,9 мільёна расійскіх рублёў, з прафіцытам у памеры 385,2 мільёна расійскіх рублёў. Сродкі бюджэту мяркуецца накіраваць на фінансаванне 7 праграм, 2 праектаў і 41 мерапрыемства Саюзнай дзяржавы ў агульнай суме 5 670,8 мільёна расійскіх рублёў у сферах ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва і пагранічнай бяспекі, распрацовак у сферах высокіх тэхналогій, касмічных распрацовак, інфармацыйнай бяспекі.**

Таксама парламентарыі разгледзелі і прынялі праект мадэльнага заканадаўчага акта «Аб прыгранічным супрацоўніцтве ў Саюзнай дзяржаве». Быў вырашаны і шэраг арганізацыйных пытанняў.

Ігар Сергяенка таксама запрасіў калег на выбары Прэзідэнта, якія адбудуцца ў Беларусі 26 студзеня: «Будзем рады бачыць дэлегацыю Парламенцкага сходу сярод міжнародных назіральнікаў».

**Паводле прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы Анатолю Анатольевічу Булаўку ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# Актуальны парадак дня

## Пасяджэнне Савета кіраўнікоў урадаў дзяржаў — удзельніц СНД прайшло ўчора, 12 снежня, у Маскве

**Як падкрэсліў прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА, пасяджэнне Савета кіраўнікоў урадаў дзяржаў — удзельніц СНД праходзіць на фоне зменлівай геапалітычнай сітуацыі і фарміравання новага шматпалярнага свету.**



Фота БелТА.

— У гэтай сувязі значна ўзрастае роля рэгіянальных эканамічных аб'яднанняў, якія ва ўмовах турбулентнасці набываюць большую вагу, самастойнасць і забяспечваюць устойлівы эканамічны рост дзяржаў-удзельніц. Паказальны прыклад — наша Садружнасць Незалежных Дзяржаў, — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

**Раман Галоўчанка агучыў на пасяджэнні найбольш прыярытэтныя задачы ў СНД, сярод якіх тэхналагічны суверэнітэт, прамкааперацыя і ліквідацыя бар'ераў ва ўзаемным гандлі.**

Што датычыцца забеспячэння тэхналагічнага суверэнітэту на прасторы Садружнасці, Раман Галоўчанка адзначыў: адзін з галоўных яго складнікаў — эфектыўная прамысловая кааперацыя:

— Летась вельмі своечасова мы зацвердзілі канцэпцыю развіцця прамысловай кааперацыі і комплекс мер па яе развіцці да 2030 года, — нагадаў ён і звярнуў увагу, што неабходна рабіць акцэнты на такіх галінах, як мікраэлектроніка, станкабудаванне, авіябудаванне. — Таму заключэнне сёння пагаднення аб развіцці грамадзянскага суднабудавання павінна ўнесці ўклад і ў развіццё супрацоўніцтва ў навукова-тэхнічнай і тэхналагічнай сферах.

Між іншым прэм'ер-міністр падкрэсліў: важна потым напоўніць гэта пагадненне адпаведнымі галіновымі праграмамі.

Яшчэ адзін найважнейшы напрамак, на які звярнуў увагу Раман Галоўчанка, датычыцца ўстаранення бар'ераў, якія пакуль што ёсць ва ўзаемным гандлі:

**— У пазітыўным ключы адзначаем дзейнасць рабочай групы высокага ўзроўню для абмеркавання існуючых гандлёвых бар'ераў. Падрыхтаваным да падпісання пратакольным рашэннем прапануецца разгледзець магчымасць пачатку перагавораў аб унясенні змяненняў у Дагавор аб зоне свабоднага гандлю 2011 года, — расказаў прэм'ер-міністр і агучыў чаканні на наступным пасяджэнні савета заслухаць вынікі работы па ўнясенні змяненняў у гэты дагавор.**

Раман Галоўчанка адзначыў, што для пяці краін — Арменіі, Беларусі, Кыргызстана, Расіі і Таджыкістана — ужо ўступіла ў сілу пагадненне аб свабодным гандлі паслугамі, і выказаў спадзяванне на больш хуткае завяршэнне ратыфікацыйных працэдур Казахстанам і Узбекістанам:

— Пасля чаго прадоўжым работу па далейшай лібералізацыі ўзаемнага гандлю паслугамі, — дадаў кіраўнік беларускага ўрада.

На яго думку, уяўляецца абгрунтаваным большы акцэнт рабіць на развіцці ўзаемных інвестыцый:

— Гэтай мэце паслужыць абноўленае падпісанага яшчэ ў 1993 годзе пагаднення аб супрацоўніцтве ў галіне інвестыцыйнай дзейнасці і прыняцце комплексных мер па прыцягненні і стымуляванні развіцця ўзаемных інвестыцый у СНД на перыяд да 2030 года.

**Раман Галоўчанка падкрэсліў: забяспечанасць прадуктамі харчавання для любой краіны — пытанне нацыянальнай бяспекі: — Для нашых краін гэта таксама актуальна. Таму вітаем работу над новай рэдакцыяй праекта пагаднення аб міждзяржаўных узаемаадносінах па пытаннях аграпрамысловага комплексу.**

Беларускі прэм'ер працягнуў: транспарт і лагістыка — таксама найважнейшая сфера:

— Таму мемарандум аб супрацоўніцтве ў галіне лічбавай трансфармацыі транспартнага комплексу, які мы сёння падпішам, будзе садзейнічаць інтэграцыі і бяспецы транспартных сістэм рэгіёна.

Трэба сказаць, што ў парадку дня кіраўнікоў афіцыйных дэлегацый дзяржаў СНД было і наведванне новага кампуса МДТУ імя Н. Э. Баўмана. Гэта адзін з найбуйнейшых і найскладанейшых праектаў у сферы вышэйшай прафесійнай адукацыі ў Расіі. Праект рэалізаваны ў рэкордна кароткія тэрміны, кіраўнікам афіцыйных дэлегацый прадэманстравалі вынік.

**Міхаіл МІШУСЦІН, старшыня Урада Расійскай Федэрацыі: — Мы зацікаўлены ва ўмацаванні гістарычна створаных эканамічных і гуманітарных сувязяў. Доля дзяржаў Садружнасці ў знешнім гандлі Расіі вырасла да 16 %, а наш узаемны тавараабарот за тры кварталы бягучага года дабавіў больш за 11 %.**

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

26 студзеня 2025
ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# ВЫБАРЧЫЯ ЎЧАСТКІ ЎТВОРАНЫ

Завяршыўся этап утварэння ўчасткаў для галасавання па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. На тэрыторыі краіны ўтворана 5325 участкаў, паведамілі ў Цэнтрвыбаркаме.

Найбольшая колькасць участкаў для галасавання сфарміравана ў Гомельскай і Мінскай абласцях (925 і 894 адпаведна), 861 — у Брэсцкай вобласці, 701 — у г. Мінску, 683 — у Магілёўскай вобласці, 672 — у Віцебскай вобласці і 589 — у Гродзенскай вобласці.

У ЦВК нагадалі, што не пазней за 20 снежня ў мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ажыццяўляецца падача дакументаў аб вылучэнні прадстаўнікоў у склад участковых камісій.

Напярэдадні

# БЕЛАРУСКІ БРЭНД ДАБРАЧЫННАСЦІ

## Старт акцыі «Нашы дзеці», якая праходзіць пад патранатам Прэзідэнта, сёлета будзе дадзены ў Віцебску

**З панядзелка, 16 студзеня, у Беларусі пачнецца самая маштабная зімовая дабрачынная акцыя «Нашы дзеці». Сёлета старт ёй будзе дадзены на Віцебшчыне, а святочныя мерапрыемствы адначасова пачнуцца літаральна ва ўсіх раёнах нашай краіны. На галоўную ёлку ў Палац Рэспублікі з удзелам кіраўніка дзяржавы запросяць больш чым 2300 хлопчыкаў і дзяўчынак.**



### ДАРЭЧЫ

З 26 снежня распачынаецца яшчэ адна цёплая навагодняя акцыя, ініцыятарам якой стаў Прэзідэнт Беларусі, — «Ад усёй душы». Падчас яе ўвага будзе накіравана на адзінокіх пенсіянераў, інвалідаў — тых, хто мае патрэбу ў падтрымцы. На навагоднія святы ў нашай краіне ніхто не павінен адчуваць сябе самотным і пакінутым.

### Другі год у новым фармаце

— Наша традыцыйная акцыя дапамагае прыцягнуць увагу да праблем дзяцінства, аказаць дапамогу і падтрымку найменш абароненым катэгорыям дзяцей, якія маюць асаблівую патрэбу ў клопаце і ўвазе, — заўважыла **галоўны спецыяліст упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Алена ВАЙЦЯХОВІЧ.**

Падчас акцыі вышэйшыя службовыя асобы, кіраўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, дзяржаўныя і іншыя арганізацыі, грамадскія аб'яднанні наведваюць больш за 130 устаноў, сярод якіх медыцынскія і адукацыйныя ўстановы, цэнтры карэкцыйнага навучання і рэабілітацыі, дзіцячыя дамы сямейнага тыпу.

З мінулага года старт акцыі праходзіць у новым фармаце, і штогод эстафету адкрыцця будзе падхопліваць новы рэгіён. Летась гэта была Брэсцкая вобласць, сёлета — Віцебшчына. Урачыстая цырымонія пройдзе ў казачнай навагодняй атмасферы, хлопчыкаў і дзяўчынак чакаюць сюрпрызы і падарункі. Юных удзельнікаў запрошана, дарэчы, больш за 200. Падчас цырымоніі адкрыцця будзе арганізаваны тэлемост з усімі рэгіёнамі.

### На галоўную ёлку

На галоўную ёлку краіны запросяць дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, і дзяцей з іншых сацыяльна ўразлівых катэгорый, а таксама дзяцей, якія дасягнулі поспехаў у вучобе і грамадскай рабоце, пераможцаў рэспубліканскіх і рэгіянальных алімпіяд, творчых конкурсаў, фестываляў, спартыўных спаборніцтваў.

Навагодні баль для моладзі з удзелам кіраўніка дзяржавы, які пройдзе ў Палацы Незалежнасці, стане яшчэ адной значнай падзеяй акцыі. На баль запрошаны больш чым 300 юнакоў і дзяўчат: студэнты ВНУ, навучэнцы сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных устаноў, а таксама маладыя людзі, якія дасягнулі значных поспехаў у вучобе, з'яўляюцца стыпендыятамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі, пераможцамі конкурсаў і спаборніцтваў.

За перыяд існавання акцыі яе маштабы значна пашырыліся. Штогод далучаецца ўсё больш арганізацый, прадпрыемстваў і грамадзян, якія жадаюць прыняць удзел у віншаванні дзяцей. А ў мерапрыемствах, якія пройдуць у Палацы Рэспублікі і Палацы Незалежнасці, плануецца ўдзел дэлегацый дзяцей з Расіі, Літвы і Латвіі.

— Акцыя «Нашы дзеці» за час свайго існавання стала сапраўды беларускім брэндам і аналагаў ёй няма. Асабліваць яе ў тым, што ўсё беларускае грамадства далучаецца да акцыі, а беларусы не застаюцца раўнадушнымі да праблем дзяцей, — рэзюмавала Алена Вайцяховіч.

**Алена КРАВЕЦ.**

Задача ад Першага

*Зразумела, што ў такой сітуацыі, пры такой палітыцы мы і пенсіянераў, і інвалідаў, і дзяцей-сірот павінны падтрымліваць. І ўвогуле, па тым, як мы вырашаем гэтыя пытанні, мяркуюць пра ўладу.*

*Аляксандр Лукашэнка, заслухоўваючы даклад па мерах удасканалення сацыяльнай абароны насельніцтва. 15 кастрычніка 2024 года.*

# ДЛЯ ПАВЫШЭННЯ ЯКАСЦІ ЖЫЦЦЯ ПАЖЫЛЫХ І ІНВАЛІДАЎ

**Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Марына АРЦЁМЕНКА:**

**— Сёння дзяржава прымае ўсе меры для павышэння якасці жыцця пажылых грамадзян. Неад'емнай часткай сістэмы дзяржаўнай падтрымкі з'яўляецца пенсіённае забеспячэнне. Пенсіянерам у нас з'яўляецца кожны чацвёрты. І пенсіённая сістэма сёння функцыянуе стабільна, забяспечваецца своечасовасць выплаты пенсій. Расходы на выплату пенсій складаюць штогод каля дзевяці працэнтаў ВУП, і гэта супастаўна з развітымі краінамі. У 2024 годзе на гэтыя мэты будзе накіравана больш як 22 мільярды рублёў.**

Галоўная задача ў пытанні пенсій — арыентацыя на рэальны рост. І гэта задача выконваецца. У лютым на 10 працэнтаў былі павялічаны памеры ўсіх працоўных пенсій. А таксама па рашэнні кіраўніка дзяржавы з 1 кастрычніка праведзены другі пераразлік працоўных пенсій. У сукупнасці памер пенсій павялічаны на 15 працэнтаў. Сярэдні памер працоўнай пенсіі непрацоўнага пенсіянера з кастрычніка складае 852 рублі.

Многія пенсіянеры ў краіне прымаюць рашэнне прадоўжыць працоўную дзейнасць. Так, гэта кожны пяты пенсіянер, або 445 тысяч чалавек (21,5 працэнта ад агульнай колькасці пенсіянераў). Для рынку працы вельмі каштоўны гэты рэсурс. З 1 студзеня 2025 года ўступіць у сілу адна з самых чаканых норм: усе працоўныя пенсіянеры будуць атрымліваць пенсію ў поўным памеры. Акрамя таго, у новым праекце закона «Аб змяненні законаў па пытаннях занятасці насельніцтва» для павышэння канкурэнтаздольнасці на рынку працы грамадзянам за пяць гадоў да дасягнення пенсіённага ўзросту ўстаноўлены дадатковыя гарантыі. Гэта захаванне для беспрацоўных гэтай катэгорыі выплат дапамог па беспрацоўі на працягу шасці месяцаў. Для іншых катэгорый гэты перыяд скарачаецца. Працаўладкаванне ў лік устаноўленай броні. Раней — за два гады да агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту, цяпер прапануецца за пяць гадоў. Таксама поўная або частковая кампенсацыя наймальнікам затрат на прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі.

За апошнія гады ў краіне адзначаецца прагрэс у вырашэнні праблем людзей з інваліднасцю. Гэта праяўляецца і ў мерах дзяржаўнай палітыкі, і ў адносінах грамадства да людзей з інваліднасцю. Такое слова, як інклюзія, яшчэ нядаўна не мела шырокага распаўсюджвання, а сёння мы ўжо гаворым аб інклюзіі як аб неабходнай умове рэалізацыі правоў інвалідаў у розных сферах жыццядзейнасці. Гэта датычыцца і магчымасці атрымання адукацыі, працаўладкавання, удзелу ў грамадскім жыцці і многіх іншых пытанняў. У кантэксце дзяржаўнай палітыкі людзі з інваліднасцю не аб'ект сацыяльнай дапамогі, а паўнапраўныя члены грамадства, для рэалізацыі якіх ствараюцца неабходныя дадатковыя ўмовы.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Месца рэгістрацыі змяніць можна

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ёсць і абсалютныя новаўвядзенні. Упершыню ў заканадаўстве нашай краіны устанаўліваецца норма аб тым, што наступствам прызнання судом несапраўднай здзелкі з нерухомай маёмасцю з'яўляецца несапраўднасць дзяржаўнай рэгістрацыі гэтай здзелкі і заснаваных на ёй правоў. Такім чынам выключаецца неабходнасць ініцыіравання зацікаўленай асобай судовага разбору па асобных исках аб несапраўднасці дзяржаўнай рэгістрацыі пасля заканчэння судовага працэсу, які ўстанавіў несапраўднасць здзелкі.

Таксама у адпаведнасці з абноўленым законам цяпер інфармацыя рэгістра нерухомасці будзе папаўняцца звесткамі аб наяўнасці зямельнай спрэчкі, адзначыла Святлана Юркавец. «Крыніцай інфармацыі аб зямельнай спрэчцы будуць мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы і суды, якія разглядаюць такія спрэчкі. Інфармацыя будзе паведамляцца рэгістратарам набытчыку зямельнага ўчастка і размешчанага на ім аб'екта нерухомасці пры засведчанні здзелкі. Гэта дазволіць забяспечыць пакупніка поўнай і аб'ектыўнай інфармацыяй аб набытых аб'ектах і магчымых праблемах пры іх выкарыстанні, нават калі прадавец яе схаваў. Гэтыя звесткі будуць адлюстроўвацца і ў выпісцы з рэгістрацыйнай кнігі».

Закон таксама ўстанаўлівае абавязковасць рэгістрацыі нерухомасці і тэрмін, на працягу якога неабходна па яе звярнуцца, — шэсць месяцаў з даты дакумента, які з'яўляецца падставай для рэгістрацыі. Пры гэтым захоўваецца магчымасць устанаўлення заканадаўчым актам іншага тэрміну — больш кароткага або, наадварот, працяглага.

Змяняецца парадак узаемадзеяння паміж натарыусамі і рэгістратарамі па пытаннях, звязаных з рэгістрацыяй аб'ектаў нерухомасці, у дачыненні да якіх натарыусам здзяйсняюцца натарыяльныя дзеянні. Згодна з падпісаным дакументам, калі па выніках здзяйснення натарыяльных дзеянняў неабходны дзяржаўная рэгістрацыя нерухомасці або ўнясенне выпраўленняў у рэгістр нерухомасці, натарыус без дадатковага волевыяўлення свайго кліента будзе накіроўваць у электронным выглядзе свой натарыяльны акт і апавяшчэнне аб рэгістрацыі або аб унясенні выпраўленняў рэгістратару. Цяпер гэта становіцца абавязкам натарыуса.

У сувязі з гэтым выключаецца неабходнасць самастойнага звароту чалавека да рэгістратара пасля наведвання натарыуса, забяспечваецца абарона правоў уласнікаў нерухомасці ў сувязі са своечасова ажыццёўленай рэгістрацыяй, павышаецца дакладнасць рэгістра нерухомай маёмасці.

Важным момантам з'яўляецца рашэнне, у адпаведнасці з якім да 1 студзеня 2028 года падаўжаецца тэрмін звароту па легалізацыю самавольна занятых зямельных участкаў, лічыць Святлана Юркавец.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Организатор аукциона:** ООО «САНЗУРА», Минская область, Молодечненский р-н, г. п. Чисть, ул. Заводская, д. 3/1, комната 1-24

**Оператор:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by

**Продавец:** ОАО «Опытный завод металлоконструкций», 220073, г. Минск, пр-т Пушкина, 68

**Предмет электронных торгов: имущество (бывшее в употреблении), расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Пушкина, 68**

**Перечень 1 (снижение начальной стоимости на 70 %)**

| Лот № | Наименование | Инв. номер | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1. | Выпрямитель для дуговой сварки ВДУ 1250 УЗ | 386.2 | 4 968,00 |
| 2. | Выпрямитель для дуговой сварки ВДУ-506С УЗ | 383.2 | 468,00 |
| 3. | Выпрямитель для дуговой сварки ВДУ-506С УЗ | 384.2 | 468,00 |
| 4. | Ножницы листовые НБ633 | 33.3 | 1 296,00 |
| 5. | Ножницы листовые Н-481А | 46.3 | 11 448,00 |
| 6. | Окрасочный агрегат «Кинг» XL70 K70FH1 | 515.1 | 3 672,00 |
| 7. | Печь эл.4*8*2.5/1042 | 241.5 | 1 116,00 |
| 8. | Печь эл.СНО-3*6*2/10 | 225.5 | 1 368,00 |
| 9. | Полуавтомат для дуговой сварки ПДГО-510 сер.02 исп. 30 | 484.1 | 356,40 |
| 10. | Полуавтомат для дуговой сварки ПДГО-510сВДУ-506 | 419.1 | 1 224,00 |
| 11. | Полуавтомат для дуговой сварки ПДГО-510сВДУ-506 | 418.1 | 1 224,00 |
| 12. | Полуавтомат сварочный Powertekc 355C | 488.1 | 2 592,00 |
| 13. | Полуавтомат сварочный ПДГ-508М-1 | 405.4 | 180,00 |
| 14. | Полуавтомат сварочный ПДГ-508М-1 | 403.4 | 352,80 |
| 15. | Полуавтомат сварочный с аксессуарами NB-500 | 405.5 | 1 116,00 |
| 16. | Полуавтомат сварочный ПДГ-200 | 407.4 | 126,00 |
| 17. | Пресс кривошипный К-2330Б | 31.3 | 5 148,00 |
| 18. | Пресс кромко гибочный РКХА | 42.3 | 16 812,00 |
| 19. | Пресс однокривошипный КВ2132 | 84.3 | 19 620,00 |
| 20. | Пресс правгиб 2Н40 | 63.3 | 6 876,00 |
| 21. | Сварочный выпрямитель ВС600 | 379.4 | 266,40 |
| 22. | Сварочный трансформатор АДФ-1002 | 157.4 | 1 368,00 |
